**АНДРЭ́Й**, прысвятак *народнага календара*. Адзначаўся 30 лістапада с.ст. (хрысціянскае свята апостала Андрэя Першазванага). Адметнае варажбой, якую наладжвала моладзь (дзяўчаты звычайна варажылі на суджанага). Акрамя агульных форм варажбы (выліванне на ваду расплаўленага воску, выкраданне мужчынскага адзення і г.д.), у гэты дзень дзяўчаты, загадваючы на суджанага, «высявалі» насенне лёну ці канапель ля калодзежа, каля палонкі або ў пасцелі і прыгаворвалі: «Святы Андрэю, канапелькі сею, дай мне знаць, з кім буду век каратаць» (калі кінутае ў агародзе вясной насенне добра прарастала, гэта абяцала дзяўчыне шчаслівы шлюб). Каб жаданні лепш збываліся, дзяўчаты цэлы дзень стараліся вытрымліваць пост і пазбягалі размоў.

*Літ.*: Васілевіч У. Беларускі народны каляндар. Мн., 1993. С. 63—64; Лозка А.Ю. Беларускі народны каляндар. Мн., 1993. С. 190; «Дай, Божа, знаць, з кім век векаваць: Бел. нар. варажба. Мн., 2002. С. 44—48.

*У. А. Васілевіч.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ